## Тут шануюць іх памяць

У ПТВ № 68 створаны музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Пачынаецца ён з карты Афганістана, на якой адзначаны баявы шлях нашых воінаў. На стэндах — асабістыя рэчы, дакументы, узнагароды загінуўшых — Сяргея Сіліча, Івана Сніцарэнкі, Уладзіслава Вяраксы і іншых воінаў. За што яны аддалі свае маладыя жыцці, за якія ідэалы — хто з экскурсаводаў можа сёння растлумачыць гэта?..

На стэндах — здымкі загінуўшых воінаў-мазыран: Анатоля Мельнічэнкі, Ігара Патапчука, Уладзіміра Бабра, Аляксандра Дубеня, Уладзіміра Семяненкі.

Памяць аб загінуўшых захоўваюць іх баявыя сябры, якія прайшлі вогненнымі дарогамі Афганістана. У музеі праводзяцца сустрэчы моладзі з ветэранамі, з бацькамі загінуўшых герояў. Памяць пра ахвяры далёкай, чужой вайны жыве...

*Т. Піліпчук*

РЭКВІЕМ

З краіны афганскай вярнуліся ў цынку —
Не суджаны быў ім шчаслівы працяг.
Сівее матуля няўцешная: «Сынку!..»
І бацьку пячэ невыносна ў грудзях.

За светам забітыя іх летуценні
Навекі засыпалі родным пяском.
Блукаюць між намі іх светлыя цені
З хлапечым над верхняй губою пушком.

Іх бардамі мужнасць герояў апета,
І чуецца ў песні бравурны трубач.
А ці ж на жалобу накладзена вета? —
Аплач жа, зямля мая, хлопцаў, аплач.

Згадаюць сябры, не забудзе нявеста.
І скрозь, дзе яны дарагімі былі,
О маці-зямля! Ад Чукоткі да Брэста
Слязамі дажджоў іх магілы палі.

Хай слёзы твае нам сумленне апаляць,
Бо ці ж перад імі няма ў нас віны?
Няхай зберажэ наша горкая памяць
Абраннікаў гэткай нянашай вайны.

*Мікола Кусянкоў*

# Мазыране, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту

**АЛІКЕВІЧ Генадзь Велюсавіч,** н. у 1972 у в. Шчакатава, прапаршчык, загінуў 19.11.1992.

**АРЦЮШЭНКА Іван Васілевіч,** н. у 1951 у в. Майская, рад., памёр 10.5.1970.

**БАРАНОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч,** н. у 1961, сяржант, загінуў 29.5.1981.

**БАРЫСЕНКА Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1962 у г. Мазыр, рад., загінуў 5.5.1982.

**БАТУРЭВІЧ Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1957, мал. сяржант, загінуў 27.2.1976.

**БЕЗВУГЛЯК Віктар Міхайлавіч,** н. у 1961 у г. Мазыр, рад., памёр 15.4.1981.

**БОБР Аляксандр Сяргеевіч,** н. у 1968 у в. Козенкі, ст. матрос, загінуў 1.4.1988.

**ГАРБАТОЎСКІ Міхаіл Адамавіч,** н. у 1934, рад., загінуў 9.3.1956.

**ГЕРАСІМОВІЧ Віктар Мацвеевіч,** н. у 1927 у в. Гіневічаў Груд, рад., загінуў у 1950.

**ГЛЮЗ Анатоль Уладзіміравіч,** н. у 1967 у в. Стараселле, матрос Паўночнага флоту, загінуў 7.3.1985.

**З характарыстыкі камандзіра вайсковай часці**

Матрос Анатоль Глюз служыў шафёрам БТР у дэсантна-штурмавой роце марской пяхоты Чырванасцяжнага Паўночнага флоту.

Таварышы па службе ведалі яго як дысцыплінаванага, добрасумленнага матроса. Ён карыстаўся заслужаным аўтарытэтам у камандзіраў і таварышаў па службе, заўсёды выдатна выконваў свае абавязкі.

Служба Анатоля праходзіла ў складаных умовах далёкай Поўначы, дзе немагчыма без вайсковага таварыства і сапраўднай флоцкай дружбы паспяхова выконваць абавязкі па абароне Радзімы. 7 сакавіка 1985 года пры выкананні службовых абавязкаў, ратуючы сябра, Анатоль трагічна загінуў...

**ДАШКЕВІЧ Генадзь Антонавіч,** н. у 1952 у в. Лешня, прапаршчык, загінуў 2.11.1977.

**ДЗЕМІДОВІЧ Іван Фёдаравіч,** н. у 1944,



А. У. Бараноўскі



А. У. Глюз



С. Д. Дзяцел



М. Г. Казак



А. М. Корнеў



М. Я. Літвінчук

рад., загінуў 18.12.1964, пахаваны ў г. Будапешт, Венгрыя.

**ДЗЯЦЕЛ Сяргей Дзмітрыевіч,** н. у 1932 у в. Лешня, мал. сяржант, загінуў на вайсковых вучэннях 27.9.1953 у Грузіі.

**ЕЎЖЫК Іван Дзмітрыевіч,** н. у 1949 у в. М. Зімовішчы, рад., загінуў у 1971.

**ЖДАНАЎ Анатоль Дзмітрыевіч,** н. у 1945, прапаршчык, загінуў 2.7.1987.

**ЖУРАЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч,** н. у 1970 у г. Мазыр, рад., загінуў 30.11.1989 у Нагорным Карабаху.

**ЗАДВОРСКІ Уладзімір Якімавіч,** н. у 1926 у в. Міхалкі, рад., памёр 8.7.1950.

**КАДОЛ Міхаіл Іванавіч,** н. у 1957 у г. Мазыр, прапаршчык, загінуў 25.10.1991.

**КАДОЛ Уладзімір Сцяпанавіч,** н. у 1936 у в. Васькаўка, рад., загінуў 11.7.1956.

**КАЗАК Мікалай Гаўрылавіч,** н. у 1940, рад., загінуў 21.8.1962.

**КАНАВОД Аляксандр Іванавіч,** н. у 1958, рад., загінуў 21.9.1977.

**КАНОПЛІЧ Васіль Фёдаравіч,** н. у 1957 у в. Дзербінка, рад., загінуў 11.10.1976.

**КАНОПЛІЧ Міхаіл Кузьміч,** н. у 1948 у в. Махнавічы, прапаршчык, загінуў у 1970 у Германіі.

**КАРЖЭЎСКІ Уладзімір Міхайлавіч,** н. у 1955 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў у 1974.

**КЕБЕЦ Уладзімір Міхайлавіч,** н. у 1937, рад., загінуў 22.8.1960 у г. Смаленск.

**КІРЫЧЭНКА Ігар Уладзіміравіч,** н. у 1965 у г. Мазыр, рад., загінуў 4.3.1985.

**КІРЭЕЎ Віктар Сцяпанавіч,** н. у 1945, капітан, памёр 5.4.1973.

**КОРНЕЎ Аркадзь Мікалаевіч,** н. у 1946, палкоўнік, загінуў 16.10.1987, пахаваны ў г. Мазыр.

**ЛАЎШУК Сяргей Уладзіміравіч,** н. у 1964 у г. Мазыр, рад., загінуў 5.8.1984 у Германіі.

**ЛІС Сафія Аляксееўна,** н. у 1955 у в. Барыскавічы, рад., памерла 21.10.1977.

**ЛІТВІНЧУК Міхаіл Якаўлевіч,** н. у 1931 у в. Заводны Востраў, яфрэйтар, загінуў 26.10. 1956 у Венгрыі.

**МАЗУРКЕВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч,** н. у 1959 у в. Слабада, рад., загінуў 29.7.1980.

**МАЙСТРОВІЧ Аляксандр Сцяпанавіч,** н. у 1962 у в. Гурыны, рад., загінуў 19.9.1982.

**МАШКОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч,** н. у 1954 у в. Нагорныя, рад., загінуў 15.7.1973.

**МЕЛЕХАЎ Якаў Мікалаевіч,** н. у 1950, рад., памёр 8.1.1970.

**МІШЧАГІН Уладзімір Анатольевіч,** н. у 1972 у в. Бабраняты, рад., загінуў 9.3.1992.

**МУРАШКА Уладзімір Мікалаевіч,** н. у 1953, прапаршчык, памёр 7.11.1993.

**НАВУМЕНКА Сяргей Мікалаевіч,** н. у 1969 у в. Надаткі, сяржант, загінуў 19.9.1988.

**НЯХАЙ Васіль Уладзіміравіч,** н. у 1955, сяржант, загінуў 9.4.1975.

**ПАНГЛІШ Віктар Пятровіч,** н. у 1932 у в. Барбароў, рад., загінуў 31.10.1951 у г. Гусеў Калінінградскай вобл.

**ПАРХОМЕНКА Сяргей Васілевіч,** н. у 1965, рад., загінуў 4.7.1985 у Германіі.

**ПАТАПЧУК Ігар Андрэевіч,** н. у 1950, ст. лейтэнант, ваяваў у Афганістане, цяжка паранены, загінуў у чэрвені 1988.



Я. У. Работнаў

**ПІКУЗА Валянцін Уладзіміравіч,** н. у 1935 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў 6.11.1956 у Венгрыі.

**ПРАХАРЭНКА Аляксей Емяльянавіч,** н. у 1938 у в. Раманаўка, мал. лейтэнант, загінуў 7.7.1961 у г. Востраў Пскоўскай вобл.

**РАБОТНАЎ Ян Уладзіміравіч,** н. у 1968 у г. Мазыр, рад., загінуў 24.11.1988 у г. Уладзівасток.

**РАБЧАНКА Рыгор Майсеевіч,** н. у 1962, рад., загінуў 7.2.1982.

**РАВУЦКІ Уладзімір Валянцінавіч,** н. у 1958 у в. Дразды, рад., загінуў 11.8.1978.

**РАШАНЦАЎ Андрэй Барысавіч,** н. у 1963 у в. Лучажэвічы, рад., загінуў 6.1.1988.

**РУДЗЬКО Аляксандр Яўхімавіч,** н. у 1955, сяржант, загінуў у 1974.

**САВІЦКІ Васіль Фёдаравіч,** н. у 1952 у г. Мазыр, рад., загінуў 19.9.1973.

**САВІЦКІ Уладзімір Аляксандравіч,** н. у 1963 у в. Заводны Востраў, ст. прапаршчык, загінуў 7.8.1991.

**СІТНІК Рыгор Аляксеевіч,** н. у 1935 у в. Хамічкі, матрос, загінуў у 1955 у г. Севастопаль.

**СУЗЬКО Юрый Мікалаевіч,** н. у 1975 у в. Козенкі, сяржант, загінуў 21.3.1995.

**СУЛІМСКІ Аўрам Фёдаравіч,** н. у 1935 у в. Майсееўка, ст. матрос, загінуў у 1955 у г. Севастопаль.

**ХМЯЛЕЎСКІ Валянцін Ціханавіч,** н. у 1943 у в. Скрыгалаў, памёр 10.6.1965 у Германіі.

**ЦЫБЛІЕНКА Міхаіл Мікалаевіч,** н. у 1968 у в. Лучажэвічы, прапаршчык, загінуў 25.11.1990.

**ЧАРЭЎКА Аляксандр Сцяпанавіч,** н. у 1943 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў 15.6.1963.

**ЧОРНЫ Іван Фядосавіч,** н. у 1925 у в. Лешня, сяржант, загінуў 8.2.1950.

**ЧУБ Дзмітрый Сцяпанавіч,** н. у 1920 у в. Слабодка, ст. лейтэнант, загінуў у 1970.

**ШЭРАШ Міхаіл Васілевіч,** н. у 1952 у в. Барбароў, рад., загінуў 3.7.1972.

**ЮРГА Валерый Пятровіч,** н. у 1973, рад., загінуў 17.6.1992.

**ЮШЧАНКА Андрэй Нічыпаравіч,** н. у 1909, рад., загінуў у баі з нацыяналістамі 7.11. 1946 у Драгобыцкай вобл.

**ЯВОРСКІ Леанід Браніслававіч,** н. у 1960 у в. Акулінка, рад., загінуў 17.5.1986.

Спіс падрыхтавалі
*М. Бялоў, І. Пілінчук*

## Цаною жыцця

**Марціновіч Міхаіл Аляксандравіч** (н. у 1955 г.) — лейтэнант міліцыі, камандзір узвода патрульна-паставой службы Мазырскага гарадскога аддзела ўнутраных спраў. Загінуў у барацьбе з бандытамі 30.4.1983 г. Узнагароджаны медалём «За выдатную службу пры ахове грамадскага парадку».

**Царэнка Аляксандр Платонавіч** (н. у 1959 г. у в. Вялікі Бокаў). Скончыў Каменкаўскую сярэднюю школу, потым служыў у Савецкай Арміі. Ваяваў у Афганістане. У 1981 г. паступіў на службу ў органы МУС. Сяржант Царэнка быў у ліку лепшых міліцыянераў патрульна-паставой службы ў мазырскай міліцыі. Загінуў пры затрыманні злачынцаў 30.4.1983 г. За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў узнагароджаны медалём «За адвагу» і Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

...Машыну яны заўважылі на дарозе, якая вяла да чыгуначнай станцыі Мазыр. З патушанымі фарамі, без габарытных агнёў, яна на вялікай хуткасці мчалася па шашы. На каманду спыніцца ў грузавіку не адрэагавалі. «Дагнаць!» — загадаў Марціновіч шафёру, сяржанту Царэнку, і зняў трубку рацыі. Зразумеўшы, што ад «Жыгулёў» на роўнай дарозе не ўцячы, парушальнікі павярнулі з шашы ў пералесак. Папераджальны стрэл у паветра. За хмызняком, які адгароджваў шашу ад пасёлка, грузавік спыніўся. Праз лічаныя хвіліны, скрыпнуўшы тармазамі, побач стала міліцэйская машына. Марціновіч і Царэнка кінуліся да грузавіка...

...Доўгі час ГРАУС Мазыра вёў по-

шукі асабліва небяспечных злачынцаў, якія выкрадалі жывёлу — забівалі, выпатрошвалі тушы і вывозілі мяса. Была спроба вынесці сейф з бухгалтэрыі калгаса «Радзіма», але, калі спрацавала сігналізацыя, злачынцы ўцяклі. Было відаць, што дзейнічаюць нахабныя, дзёрзкія грабежнікі. У тую ноч яны ўкралі ў нарыхтоўчым пункце «Прудок» быка, мяса пагрузілі ў рэфрыжэратар.

Але іх дагнала міліцэйская машына.

Злачынцы кінуліся на міліцыянераў, бліснула лязо нажа... Яны аказаліся тварам да твару — двое бамбізаў, якіх асляпіла звярыная прага і нянавісць, і міліцыянеры. Раптоўнасць зрабіла сваю справу — выкарыстаць зброю міліцыянеры не паспелі. Удар нажа ў спіну лейтэнанта! Царэнка бачыў, як пахіснуўся, потым упаў камандзір. Цяпер яму аднаму прыйшлося адбівацца ад злачынцаў. І ён не адступіў. Ужо смяротна паранены, яшчэ змагаўся з бандытамі...

Цаною свайго жыцця М. Марціновіч і А. Царэнка садзейнічалі затрыманню асабліва небяспечных бандытаў, якія ўчынілі шэраг злачынстваў, у тым ліку і забойстваў. Іменамі Марціновіча і Царэнкі названы вуліцы ў Мазыры.

*В. Шур*

**Чарнобыльскі попел**

Чорным днём назаўсёды ў нашай гісторыі застанецца 26 красавіка 1986 г. Дзень перасцярогі... Чарнобыль надзвычай блізка ад Мазыра, усяго некалькі дзесяткаў кіламетраў напрамкі. Горад на Прыпяці пацярпеў найбольш з беларускіх буйных гарадоў. У першыя месяцы і гады забруджанасць глебы на тэрыторыі Мазыршчыны ў розных месцах дасягнула ад 1 да 10 кюры на адзін кв. км. Толькі 20 сельскіх населеных пунктаў раёна з 92 не былі пасыпаны чарнобыльскім попелам. Не намнога забруджанасць меншая і цяпер. Больш як тры тысячы мазыран прымалі ўдзел у ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Звыш дваццаці з іх ужо памерлі... 11 чалавек засталіся інвалідамі. Сярод іх — урач Л. Д. Аўгусціновіч, якая ў час аварыі выратоўвала людзей з зоны. Яна інвалід першай групы, добрыя людзі з Аўстрыі ў 1994 г. запрасілі яе на лячэнне. У многіх бяда і сягоння стаіць ля парога.

З 1986 г. у горад з зоны пераехала 510 сем'яў. Для іх тут пабудавана 600 кватэр. У Мазырскі раён з забруджанай зоны было таксама перасялена каля 300 сем'яў. Для іх пабудавана 8 пасёлкаў у вёсках Асавец, Бабраняты, Глініца, Вялікія Зімовішчы, Рамаўаўка, Скрыгалаў, Слабада і Хамічкі. Многія перасяленцы прыязджалі на



Вуліца перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны

новае месца цэлымі вёскамі і вуліцамі, каб і тут жыць побач з родзічамі і сябрамі. А жыхары вёскі Белы Бераг Нараўлянскага раёна на новым месцы, у вёсцы Скрыгалаў, захавалі памяць аб сваёй вёсцы ў назве вуліцы, дзе пасяліліся.

У снежні 1992 г. арганізавана Мазырскае аддзяленне фонду інвалідаў — удзельнікаў ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС «Дапамога». У адпаведнасці са статутам фонд клапоціцца аб інвалідах-ліквідатарах, сем'ях памерлых удзельнікаў ліквідацыі аварыі. Створаныя на грамадскіх пачатках таварыствы «Дапамога», саюз «Прыпяць» праяўляюць міласэрнасць да ўсіх грамадзян, якія пацярпелі ад аварыі.

*Т. Пиліпчук*

* * *

Таемна-задумны палескі мой краю,
Шчымлівая песня і казка.
З мазырскіх вышыняў цябе сузіраю,
А сэрцу пакутліва-цяжка.

Знудзілася маці-зямля пад нагамі
Ад гора-бяды невыноснай:
Пракляты Чарнобыль мой дзень апаганіў,
І сумна, і тлумна, і слёзна.

Я трызню цнатлівымі ў росах лугамі,
Раскошаю прыпяцкіх плёсаў.
Мне б чыстымі зноўку прайсціся гаямі,
Заснуць у духмяных пракосах.

Нямее краса, ды квітнее надзея,
І ёй, быццам Богу, малюся,
А боль неадступны са мною падзеліць
На досвітку клёкатам бусел.

*Васіль Андрыеўскі*

## Духоўныя скарбы Мазыршчыны

Палеская зямля шчодра дзеліцца з людзьмі сваімі скарбамі. Але скарбы не толькі ў зямлі, — багатая Мазыршчына і сваёй культурнай спадчынай, глыбокімі фальклорнымі вытокамі. Гэтым краем захапляліся і не раз прыязджалі сюды беларускія, рускія, польскія, украінскія этнографы і фалькларысты XIX — XX стст.: П. Шпілеўскі, А. Васільева, В. Сакалоў, Ю. Кручкоўскі, А. Кольберг, П. Чубінскі, В. Тур, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, З. Даленга-Хадакоўскі, А. Сержпутоўскі, К. Машынскі, Ч. Пяткевіч, А. Крукоўскі, І. Сербаў, П. Бузук і многія іншыя.

Багаты сваімі культурнымі традыцыямі горад Мазыр, і іх тут не толькі берагуць, але і памнажаюць. У горадзе працуе краязнаўчы музей, выставачная зала, парк культуры і адпачынку «Перамога». У розных гуртках, секцыях і клубах па інтарэсах, створаных пры ўстановах культуры, займаецца звыш 2 тысяч мазыран. 11 калектываў мастацкай самадзейнасці атрымалі званне «народны» і «ўзорны». Вялікую канцэртную дзейнасць ажыццяўляюць гарадскі духавы аркестр, ансамбль народных музыкаў «Явар», калектывы мастацкай самадзейнасці Палаца культуры «Будаўнік» трэста «Мазырсельбуд», Палаца культуры нафтаперапрацоўчага завода.

У горадзе праводзіцца шмат масавых мерапрыемстваў — святы, народныя гульні, кірмашы, фестывалі мастацтваў, агляды-конкурсы калектываў мастацкай самадзейнасці. Многія святы сталі традыцыйнымі і жаданымі для мазыран: «Каляды», «Гуканне вясны», свята горада, асеннія кірмашы і інш.

Кніжны фонд цэнтральнай сістэмы бібліятэк складае 480 тыс. экземпляраў, налічвае 29 350 чытачоў. Бібліятэкі праводзяць вялікую асветніцкую работу: створаны клубы па інтарэсах, праводзяцца сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, абмеркаванні кніг, тэматычныя выставы літаратуры, агляды кніжных навінак.